# Гісторыя

*В.А. СЯХОВІЧ*

## ДАЛУЧЭННЕ УНІЯТАЎ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ДА ПРАВАСЛАЎЯ Ў 1794–1795 гг.

Тэрыторыі, атрыманыя Расійскай імперыяй пры другім падзеле Рэчы Паспалітай, утварылі асобнае генерал-губернатарства на чале з Ц.І. Тутал-міным, у складзе якога апынуліся Ізяслаўская, Брацлаўская і Мінская губерні. Апошняя з іх аб'яднала новадалучаныя беларускія землі. 13 красавіка 1793 г., яшчэ да зацвярджэння другога падзелу сеймам Рэчы Паспалітай 11 ліпеня 1793 г., Кацярына II выдала ўказ, згодна з якім усе тры новыя губерні склалі адну праваслаўную Мінскую епархію; на чале яе, як і раней, заставаўся Віктар Садкоўскі, узведзены пры гэтым у сан архіепіскапа[1].

У 1793 г., ужо з першых часоў дзейнасці Мінскага архіепіскапа, да яго пачалі звяртацца некаторыя уніяты, жыхары Кіеўшчыны, з просьбай аб далучэнні да праваслаўя. Баючыся ўзяць на сябе адказнасць, ён звярнуўся да пецярбургскага мітрапаліта Гаўрыіла, каб той дазволіў яму прыехаць у Пецярбург для вырашэння гэтага пытання. Такая паездка адбылася[2]. Вынікам яе стала з'яўленне імператарскага ўказа ад 22 красавіка 1794 г., які выклікаў карэнную змену ў адносінах да уніяцкага пытання. У дакуменце гаварылася: «Яе імператарская вялікасць, даведаўшыся, што жыхары губерняў: Брацлаўскай, Ізяслаўскай і Мінскай... выказваюць цяпер шчырае іх жаданне вярнуцца да сапраўднай іх мацеры, царквы праваслаўнай, найвысачэйша загадаць пажадала прызначанаму ў тых губернях на пасаду генерал-губернатара пану... Туталміну ў выкананні такога святога намеру верных яе падданых падаваць, у чым належыць, ад свецкага кіраўніцтва абарону і дапамогу; а свяцейшаму правячаму сіноду прадастаўляе даручыць праасвяшчэннаму архіепіскапу Мінскаму, Ізяслаўскаму і Брацлаўскаму, каб ён абнародаваў сваю пастырскую грамату, выклікаючы пражываючых у епархіі ягонай да вяртання ў праваслаўе...»[3].

Грамата ад імя архіепіскапа Віктара, аб якой тут гаворыцца, была ўжо складзена і прыкладалася да рэскрыпту, дадзенаму таго ж 22 красавіка генерал-губернатару Ц.І. Туталміну. У рэскрыпце выказваліся зусім новыя погляды ў параўнанні з ранейшымі намерамі расійскага ўрада захоўваць недатыкальнасць усіх веравызнанняў на новадалучаных землях: у ім прама гаворыцца аб «выкараненні уніі», аб'яўляецца, што «уз'яднанне» ёсць «надзейнейшы сродак для зацвярджэння народа ў аднадумстве і спакоі і што супраціўленне яму з боку католікаў і уніятаў будзе лічыцца крымінальным злачынствам, якое падлягае суду і цягне за сабой секвестр маёнтка. У гэтым самым рэскрыпце Ц.І. Туталміну прадпісвалася не весці па справах аб далучэнні перапіскі з уніяцкім мітрапалітам Растоцкім, як гэта было раней, а накіроўваць жадаючых прыняць праваслаўе да мінскага праваслаўнага архіепіскапа і толькі паведамляць Растоцкаму[4].



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

17 мая 1794 г. выйшау новы імператарскі указ, у якім патрабавалася ад губернатарау забяспечыць нагляд паліцыі за тым, каб у схіленні уніятау не было перашкод з боку іншаверных памешчыкау альбо святарбу; сіноду ж загадвалася накіраваць на дапамогу В. Садкоускаму патрэбную колькасць святарбу з іншых епархіі[5].

У той час, калі складаліся гэтыя акты, пачалося паустанне Тадэвуша Касцюшкі, якое папярэднічала апошняму падзелу Рэчы Паспалітай. Расійскі дарэвалюцыйны даследчык С. Рункевіч у «Пісторыі Мінскай архіепіскапіі (1793–1832 гг.) зауважае, што «шчаслівы указ» 22 красавіка 1794 г. і указы, якія выйшлі адразу за ім, сваёю нечаканай паспешнасцю даюць права бачыць у іх утоены «палітычны інтарэс», выкліканы нараджаючымся мяцяжом»[6]. Аналагічныя погляды на гэтую праблему выказвау і беларускі гісторык М.М. Нікольскі. Ён таксама адзначау, што у час паустання памешчыкі абапіраліся на уніяцкае духавенства[7]. Пацвярджэннем таго, што гэта не засталося па-за увагай расійскага кірауніцтва, можа служыць высылка двух уніяцкіх святарбу у Ноугарад-Северскую губерню за удзел у «польскім мяцяжы»[8].

Менавіта у гэтых абставінах архіепіскап Віктар і яго духавенства распачынаюць «справу уз'яднання». Абнародаванне у Мінскай губерні граматы, якая заклікала уніятау прымаць праваслауе, адбылося у маі і наступных месяцах 1794 г. Гэтая падзея, як піша С. Рункевіч, «не мела амаль зусім удачных вынікау», бо «у Мінскай губерні для справы уз'яднання былі такія неспрыяльныя умовы, што для барацьбы з імі патрабавалася пакласці асабліва шмат сіл і энергіі»[9].

У пачатку 1795 г. В. Садкоускі паведаміу сіноду, што яму цяжка здолець справу далучэння уніятау сваімі сіламі. У адказ на гэта была створана камісія для пошуку сродкау садзейнічання «уз'яднанню», якая складалася з пецярбургскага мітрапаліта Гаурыла, канцлера Безбародкі і генерал-губернатара Туталміна[10]. Камісія выпрацавала праект, згодна з якім Мінская епархія значна змяншалася у памерах за кошт таго, што з яе выдзялялася адна самастойная епархія (Брацлауская) і адна вікарная (Жытомірская). У гэтым дакуменце, зацверджаным імператарскім указам ад 12 красавіка 1795 г., прадугледжвалася стварэнне ва усіх трох епархіях па аднаму мужчынскаму і аднаму жаночаму манастыру. Для размяшчэння кожнага з іх павінен быу выкарыстоувацца будынак аднаго з лепшых уніяцкіх манастыроу, прычым манахі. якія там знаходзіліся, размяркоуваліся па іншых манастырах. Акрамя таго, было вырашана паслаць у вышэйназваныя епархіі праваслауныя царкоуныя кнігі па зніжанаму кошту[11].

У той час, калі рабіліся гэтыя распараджэнні, Рэчы Паспалітай ужо не існавала (у пачатку 1795 г. быу зацверджаны акт падзелу яе паміж Расіяй і Аустрыяй). Адначасова са знішчэннем Рэчы Паспалітай звальнялася належная да яе уніяцкая іерархія, глава якой, мітрапаліт Растоцкі, адмовіуся прынасіць прысягу расійскаму ураду[12]. Кафедра уніяцкага мітрапаліта і усе уніяцкія епіскапіі на тэрыторыях, перайшоушых пад уладу Расіі пры другім і трэцім падзелах, ліквідаваліся. Уніяцкім іерархам было дадзена права выбраць месцазнаходжанне па-за межамі Заходняй Расіі і прызначалася пенсія. Пенсію атрымалі і усе уніяцкія святары, якія пазбавіліся прыходау пасля прыняцця іх прыхаджанамі праваслауя. Астатнія уніяты падпарадкоуваліся уніяцкаму архібіскупу беларускаму Лісоускаму, але пры гэтым было заяўлена. што гэтае падпарадкаванне толькі часовае і не павінна перашкаджаць «уз'яднанню»[13]. Як зазначыу у сувязі з гэтым прафесар Санкт-Пецярбургскай духоунай акадэміі М.В. Каяловіч, «...урад, відавочна, трымауся ранейшай думкі знішчыць унію ва усёй Заходняй Расіі»[14].

Далучэнне уніятау у Мінскай губерні працягвалася у 1795 г. і знаходзілася пад непасрэдным кантролем мінскага губернатара Няплюева, які атрым-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

лівау рапарты аб ходзе гэтага працэсу ад сваіх падначаленых і праваслаунага духавенства. У іх паведамляецца аб цяжкасцях, якія узнікалі на шляху «уз'яднальнікау». Напрыклад, у сяле Завішчыцах Пінскай акругі шляхціц Колб не аддавау ключы ад царквы, заяуляючы, «што ён уласным коштам тую паставіу»[15]. Аканом Бартноускі у сяле Купяцічы той жа акругі не выканау загад аб скліканні сялян для прачытання ім граматы архіепіскапа і быу абвінавачаны у «застрашваннях» сялян[16]. Супраціуленне падобнага роду аказвалі і уніяцкія святары[17]. Праваслауны ігумен у лісце да Няплюева нават абвінавачвае уніяцкае духавенства у напісанні ад імя губернатара ордэра для «рассейвання незлічоных у народзе шкоднасцей»[18]. Нягладка адбывалася і перадача праваслауным базыльянскага Навадворскага манастыра[19]. У розных мясцінах стауленне простага народа да пераходу у праваслауе было неаднолькавым. Жыхары сяла Купяцічы, якое знаходзілася ва уладанні бенедыктынау, выказалі жаданне стаць праваслаунымі і прызнаваліся нават, што і цяпер у начны час тайна ходзяць на маленні на месца былога праваслаунага манастыра, пры гэтым сяляне патрабавалі змены уладальнікау, якія «апошняе дзяруць да грунта, адымаюць»[20]. У той самы час благачынны Пастаускай акругі паведамляу: «Хаця ж больш і ездзілі з участковым прыставам ... па розных сёлах, але ні у чым не маем поспеху; ды і тыя прыходы, якія самі добраахвотна далучыліся, у царкву не ходзяць і з адправамі хрыстовымі невядома куды звяртаюцца, хаця ж амаль штодзённа угаворваем іх, але яны таго не толькі каб разумець, але нават і слухаць не хочуць». Урэшце святар зауважае, што «калі не будзе найстражэйшага на тое указа, дык усяляк іх добраахвотна далучаць немагчыма»[21].

Нельга абысці маучаннем метады, якімі часам карысталіся тыя, хто здзяйсняу «уз'яднанне». Нярэдкімі былі выпадкі, калі праваслауныя святары і свецкія улады пераводзілі уніятау у праваслауе супраць іх волі, выкарыстоуваючы закрыццё уніяцкіх храмау, забарону уніяцкім святарам адпрауляць набажэнствы і г. д. Падобныя «дробныя злоужыванні і насіллі» адзначае нават М.В. Каяловіч. Яны, па яго словах, «прымалі вельмі арыгінальны характар, жыва нагадваючы справы Заходняй Расіі у часы польскага панавання»[22].

У пачатку 1796 г. мінскі архіепіскап Віктар вымушаны быу паведаміць сіноду, што «уз'яднанне» «па некаторых немалаважных прычынах прыпынілася». Яго вынікі былі зафіксаваны у «экстрактах» для сінода. Першы «экстракт» ад 6 чэрвеня 1795 г. налічвау усяго 34 далучаныя прыходы з 3 святарамі і 15 030 прыхаджанамі. Першае месца па колькасці далучаных займала Давідгарадоцка-Мазырская акруга. За ёй ішлі акругі: Слуцкая, Пінская, Бабруйская, Барысауская і, урэшце, Мінская. Другі «экстракт», датаваны 10 студзеня 1796 г., сведчыу аб далучэнні яшчэ 60 прыходау з 12 святарамі і 64 923 прыхаджанамі. Найбольшы лік далучаных прыходау давалі Давідгарадоцкая з Мазырскай (38) і Пінская (22) акругі. З гэтых лічбау бачна, што найвялікшая колькасць уніятау, перайшоушых у праваслауе, адзначаецца у паудНёвых раёнах, памежных з Украінай, дзе, як вядома, унія не мела глыбокіх каранёу і пераход у праваслауе насіу масавы характар. Агульны вынік далучэння уніятау у Мінскай губерні да 30 студзеня 1796 г. склау 94 прыходскія царквы, 30 прыпісных, 39 капліц, 15 святароу і 79 953 прыхаджаніна[23].

«Уз'яднаныя» уніяцкія прыходы з яуляліся 1/5 часткай усіх, што тут знаходзіліся[24]; большасць святароу з гэтых прыходау перайсці у праваслауе не пажадалі. Даючы ацэнку «уз'яднанню» 1794–1795 гг., М.М. Нікольскі адзначау, што поспех яго быу «вельмі няпэунай якасці, чыста папяровы»[25]. Для большасці уніятау пераход у праваслауе насіу вымушаны і фармальны характар. Гэта пацвердзілася далейшым ходам падзей, калі з прыходам да улады Паула і «уз'яднаучыя» мерапрыемствы былі прыпынены на дзяржаууным узроуні.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

[1] Гл.: Полное собрание законов Российской империи. 1-е собр. (Далей ПСЗ-І). СПб., 1830. Т. 23. № 17 113.
[2] Гл.: Коялович М. О. История воссоединения западно-русских униатов старых времен. СПб., 1873. С. 353–355.
[3] Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Вильно, 1889. Т. 16. С. 7–8.
[4] Гл.: Там жа.
[5] Гл.: Там жа.
[6] Рункевич С. История Минской архиепископии (1793–1832 гг.). СПб., 1893. С. 271.
[7] Гл.: Никольский Н. М. История русской церкви. Мн.,1990. С. 288.
[8] Гл.: ПСЗ-І. Т. 23. № 17 345.
[9] Рункевич С. Указ. соч. С. 243.
[10] Гл.: Коялович М. О. История воссоединения... С. 368.
[11] ПСЗ-І. Т. 23. № 17 318; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). Ф. 136, воп. 1, спр. 542, арк. 6–13.
[12] Гл.: Коялович М. О. История воссоединения... С. 371.
[13] ПСЗ-І. Т. 23. № 17 384; 17 391.
[14] Коялович М. О. История воссоединения... С. 371.
[15] НГАБ. Ф. 136, воп. 1, спр. 571, арк. 35; ф. 295, воп. 1, спр. 2, арк. 46.
[16] Гл.: Там жа. Ф. 295, воп. 1, спр. 2, арк. 33 адв., 34–36, 41, 42.
[17] Гл.: Там жа. Ф. 136, воп. 1, спр. 571, арк. 8–68; ф. 295, воп.1, спр. 2, арк. 27 адв., 28, 31, 31.
[18] Там жа. Ф. 295, воп. 1, спр. 2, арк. 43.
[19] Гл.: Там жа. Арк. 39, 40, 46, 49.
[20] Там жа. Арк. 33 адв.
[21] Там жа. Арк. 51 адв.
[22] Коялович М. О. Чтения по истории Западной России. СПб., 1884. С. 306–307.
[23] Гл.: Рункевич С. Указ. соч. С. 263, 403.
[24] Гл.: Киприанович Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего до настоящего времени. Вильно, 1885. С. 168.
[25] Никольский Н. М. Указ. соч. С. 289.

*К.А. РЭВЯКА*

## ВЫКАРЫСТАННЕ СЛАНОЎ У ГАНІБАЛАВАЙ ВАЙНЕ (218–201 гг. да н. э.)
### (ПА СВЕДЧАННЯХ ГРЭКА-РЫМСКІХ АЎТАРАЎ)

Прыручаных, адамашненых і выдрэсіраваных магутных сланоў у старажытнасці выкарыстоўвалі ў многіх войнах. Аб гэтым сведчаць шматлікія грэчаскія і рымскія аўтары: Палібій, Лівій, Апіян, Дыядор, Флор і іншыя даследчыкі антычнасці – А. Неміроўскі, І. Кавалёў, Т. Момзен, А. Тойнбі і інш. Вучоныя XX ст. назвалі сланоў – магутную зброю старажытнасці – "антычнымі танкамі". Шырока выкарыстоўвалі іх у войнах карфагенскі палкаводзец Ганібал і яго бацька Газдрубал. Ганібал, будучы ў Іберыі (Іспанія), наводзіў сланамі жах на мясцовых жыхароў, а ў хуткім часе пакарыў іх (Лів., XXI, 5, 10)[1]. Ганібал з дапамогай сланоў разбурыў саюзны рымлянам горад Сагунт у Іспаніі, перайшоў раку Эбра і, сеючы раздоры паміж плямёнамі, пазбавіў іх адзінства ў барацьбе з пунійцамі (карфагенянамі). Так, у паходзе на Рым пры пераправе праз раку Эбро, па словах Лівія (XXI, 5, 15), "многіх патапіла рака; другіх цячэнне занесла да непрыяцеля, дзе іх раздавілі сланы". Так сланы дапамаглі не толькі пры пераправе Эбро, але і апустошылі палі, і на працягу некалькіх дзён карфагеняне падпарадкавалі племя карпетанаў у Іспаніі (Лів., XXI, 5, 16).

Разбурыўшы непакорны саюзны рымлянам г. Сагунт, Ганібал, рыхтуючыся ў паход на Рым, умацоўваў тыл. Пакідаючы Іспанію, ён назначыў свайго брата Газдрубала з арміяй і сланамі яе намеснікам (Лів., XXI, 22, 3). На шляху да Італіі армія Ганібала дайшла да ракі Радан (Рона), праз якую неабходна было пераправіць жывёл-веліканаў. "Сланы заўчасна ўсе былі сабраны на беразе; затым самы сярдзіты з іх, прыведзены ў ярасць сваім праважатым, кінуўся за ім. Праважаты ўбег у ваду, слон рушыў за ім туды і сваім прыкладам уцягнуў усё стада ў раку; а калі жывёлы дайшлі да глыбокіх мясцін і згубілі брод, то само цячэнне ракі аднесла іх да другога берага". Ёсць і другое сведчанне Лівія (XXI, 28, 5–12) пра тое, што сланы былі перапраўлены на другі бераг на плытах, пакрытых зямлёю. Сланы ў паходзе



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm